# БІТЭЛЬ ПЯТРО



**Бітэль Пятро** (Пётр Іванавіч, 6.06.1912, мяст. Радунь Воранаўскага р-на — 18.10.1991), беларускі пісьменнік (паэт, перакладчык), педагог, праваслаўны святар. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1985). З сям'і паштальёна. Наведваў школу ў бежанстве, у Расіі. Па звароце да дому вучыўся ў Вішнеўскай школе (Валожынскі р-н). У 1925—1931гг. — у Барунскай і Віленскай настаўніцкіх семінарыях. Прыхваткамі меў настаўніцкую працу на Нясвіжчыне (1931—1933). У 1933—1934 гг. служыў у войску. Дэмабілізаваўшыся, быў беспрацоўным. У 1935-1939 гг.— загадчык пачатковай школы ў в. Даўгінава (Карэліцкі р-н). Актыўна ўдзельнічаў тут у вясковай мастацкай самадзейнасці. У жніўні 1929 г. скончыў завочна 3-гадовыя Вышэйшыя настаўніцкія курсы (гістарычна-філалагічнае аддзяленне) пры Віленскім універсітэце. У верасні 1939 г. зноў узяты ў польскае войска. Неўзабаве трапіў у савецкі палон. Вывезены ў глыбіню Расіі. Затым адпушчаны дадому. Працаваў настаўнікам у Вішнеўскай школе, дырэктарам 7-годкі №2 Валожына, інспектарам-метадыстам Валожынскага РайАНА (1939-1941 гг.). У 1942-1944 гг. настаўнічаў у Валожыне ў школе, пасля ў сярэдняй гандлёвай вучэльні. У 1944 г. высланы з сям'ёй у Германію. Па дарозе ў выніку аварыі цягніка ўдалося ўцячы. Жылі ў г. Кашалін (Польшча), апекаваліся дзецьмі, вывезенымі з Беларусі. У маі 1945 г. узяты ў савецкае войска. У пач. 1946 г. вярнуўся дамоў. Настаўнічаў у в. Забрэззе Валожынскага р-на. Вясной 1947 г. звольнены па палітычных матывах. Скончыў падрыхтоўчыя курсы ў Жыровіцкім манастыры і працаваў праваслаўным святаром у в. Міжэвічы Слонімскага р-на, з 1949 г. — у Докшыцах на Віцебшчыне. У 1950 г. рэпрэсаваны і зняволены ў Камышлагу, Омску, Джэсказгане. З 1956 г. — на радзіме. Зноў быў святаром (на Гомельшчыне). У 1962 г. страціў гэтую службу з-за праследавання ўлады. У 1963—1974 гг. — настаўнік Вішнеўскай СШ (нямецкай мовы і малявання). Завочна скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Мінскага педінстытута (1970) і цэнтральныя курсы "Ин-яз" у Маскве (1970). Артыкулы на педагагічныя тэмы друкаваў з 1937 г., вершы з 1939 г. Выдаў кнігі паэзіі "Замкі і людзі" (1968), "Паэмы" (1984), “Сказанне пра Апанаса Берасцейскага" (1984). "Дзве вайны" (1990). Друкаваўся з 1929 г. у часопісе "Шлях моладзі" пад псеўданімам Леанід з-пад Вішнева. Публікаваліся вершы і пераклады Б. ў альманаху "Даляглядьі" за розныя гады і ў розных газетах і часопісах Беларусі. Максім Танк хадайнічаў, каб частка перакладу была надрукавана ў часопісе «Полымя».

Перакладаў вершы рускіх, польскіх, нямецкіх, славацкіх, украінскіх, літоўскіх і іншых паэтаў: польскамоўныя паэмы і п'есы В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Міцкевіча, аповесць Ю. І. Крашэўскага "Хата за вёскай", (1989), паасобныя творы М. Канапніцкай, Б. Пруса, Ю. Славацкага, Г. Сянкевіча, М. Лермантава, А. Пушкіна, І. Франко, Т. Шаўчэнкі, Б. Брэхта, Ё. В. Гётэ, Ф. Шылера і інш.

**Бібліяграфія:**

1. Адрасы талентаў зямлі роднай...: Слынныя людзі Воранаўскай зямлі: П. Бітэль, Г. Булыка, Т. Нарбут // Воранаўская газета. — 1997. — 31 снежня. — С. 2.
2. Пяткевіч, А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік / А. М. Пяткевіч. — Гродна, 2000. — С. 30.